# ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎВЯДЗЕННЯ ПАСАДЫ ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ У МІНСКАЙ, ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯХ

**Г. А. Страленя**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, stralenia@bsu.by*

У Расійскай імперыі ў канцы XIX ст. была праведзена рэформа мясцовага кіравання, у ходзе якой была ўведзена новая ўлада ў сельскай мясцовасці — інстытут земскіх начальнікаў. Адным з напрамкаў іх дзейнасці стала вырашэнне асноўных праблем у сялянскім асяроддзі. У артыкуле адлюстраваны спецыфічныя рысы ўвядзення інстытута земскіх начальнікаў у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях, паказаны працэс па падрыхтоўцы да правядзення рэформы, выдзелены асаблівасці яе рэалізацыі.

***Ключавыя словы:*** земскія начальнікі; адміністрацыйныя і судовыя ўстановы; беларускія губерні; сялянскае самакіраванне.

# ПОДГОТОВКА К ВВЕДЕНИЮ ДОЛЖНОСТИ ЗЕМСКИХ НАЧАЛЬНИКОВ В МИНСКОЙ, ВИТЕБСКОЙ И МОГИЛЕВСКОЙ ГУБЕРНИЯХ

**А. А. Страленя**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, stralenia@bsu.by*

В Российской империи в конце XIX в. была проведена реформа местного самоуправления, в ходе которой в сельской местности была введена новая власть — институт земских начальников. Одним из направлений их деятельности было решение основных проблем крестьян. В статье описаны особенности введения института земских начальников в Минской, Витебской и Могилевской губерниях, показан процесс подготовки реформы, выделены особенности ее реализации.

***Ключевые слова:*** земские начальники; административные и судебные учреждения; белорусские губернии; крестьянское самоуправление.

# PREPARATION FOR THE INTRODUCTION OF THE POSITION OF DISTRICT CAPTAINS IN MINSK, VITEBSK AND MOGILEV PROVINCES

**H. A. Stralenia**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, stralenia@bsu.by*

In the Russian Empire at the end of the 19th century local government reform was carried out. Due to the reform a new authority for the rural areas was introduced — the institution of district captains. One of the areas of their activity was solving the main problems of the

peasantry. The article describes the features of the introduction of the institution of district captains in the Minsk, Vitebsk and Mogilev provinces, shows the process of preparing the reform, and highlights the features of its implementation.

***Keywords:*** district captains; administrative and judicial institutions; Belarusian provinces; peasant self-government.

Рэформа мясцовага кіравання была праведзена ў беларускіх губернях значна пазней за іншыя рэгіёны Расійскай імперыі. Падрыхтоўка да прывядзення ў дзеянне Палажэння ад 12 ліпеня 1889 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях пачалася ў 1893 г. пасля таго, як міністр унутраных спраў І. М. Дурнаво звярнуўся да мінскага губернатара М. М. Трубяцкога, з прапановай выказаць сваё меркаванне па дадзеным пытанні [1, арк. 28]. З такой прапановай міністр звярнуўся і да губернатараў віцебскага і магілёўскага.

Мінскі губернатар у адказ на зварот міністра ўнутраных спраў 2 сакавіка 1894 г. сцвярджаў, што ўвядзенне новага органа ўлады не сустрэне ніякіх цяжкасцяў у беларускіх губернях, разам з тым дазволіць больш эфектыўна вырашаць пытанні сялянскага кіравання. Губернатар лічыў, што у вызначаны перыяд службовыя асобы не спраўляліся ў поўнай меры з усімі ўскладзенымі на іх функцыямі [1, арк. 36]. Акрамя таго, ён падкрэсліваў, што земскія начальнікі змаглі б больш эфектыўна вырашаць штодзённыя пытанні, паколькі надзелены шырокімі паўнамоцтвамі і сумяшчаюць ў сваіх руках як адміністрацыйную, так і судовую ўладу.

Паралельна міністр унутраных спраў удакладніў пытанне аб колькасці ўчасткаў земскіх начальнікаў і гарадскіх суддзяў. Крытэрыямі іх вызначэння служылі наступныя параметры: колькасць валасцяў на адным участку павінна складаць ад 3 да 6, душ мужчынскага полу — ад 10 да 15 тысяч [1, арк. 81]. У сувязі з гэтым, на пасяджэнні Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці 1 верасня 1895 г. была падтрымана прапанова губернатара падзяліць тэрыторыю на 67 земскіх участкаў. Пасада гарадскога суддзі па прапанове губернскай прысутнасці павінна была быць уведзена ў Мінску, Бабруйску і Пінску [1, арк. 92].

Магілёўскі губернатар М. А. Зіноўеў у сваім звароце да міністра ўнутраных спраў наконт увядзення пасады земскіх начальнікаў падтрымаў пазіцыю М. М. Трубяцкога. Больш за тое, ён лічыў неабходным пашырыць сферу дзейнасці земскіх начальнікаў [1, арк. 46]. Да іх функцыянальных абавязкаў павінны былі перайсці, на яго думку, паўнамоцтвы па забеспячэнні страхавання сельскіх пабудоў. М. А. Зіноўеў падкрэсліў, што земскія начальнікі павінны адказваць за забеспячэнне насельніцтва харчаваннем, выдачу пазык і дапамог у выпадку пажару ці неўраджаю.

Акрамя таго, ён прапанаваў перадаць земскім начальнікам пазямельнае ўладкаванне старавераў, сельскіх вечных чыншавікоў і праваслаўных арандатараў [1, арк. 49–52].

Неабходнасць увядзення пасады земскіх начальнікаў на тэрыторыі Віцебскай губерні адстойваў віцэ-губернатар У. А. Левашоў. Яго пазіцыя па гэтым пытанні была выкладзена ў справаздачы аб стане Віцебскай губерні, якая была прадстаўлена ў Камітэце міністраў 16 мая 1895 г. Імператарам у сувязі з гэтым была зроблена паметка «Ці не рана?» [2, с. 23].

Актыўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да правядзення рэформы ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях практычна не праводзілася да 1898 г. Толькі 10 лютага 1898 г. міністр унутраных спраў І. Л. Гарамыкін накіраваў ліст мінскаму губернатару з просьбай зноў выказаць сваё меркаванне па гэтым пытанні [3, арк. 3].

У далейшым МУС прыйшло да высновы аб неабходнасці ўвядзення ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях пасады земскіх начальнікаў. Але на этапе падрыхтоўкі ўзніклі рознагалоссі паміж Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам юстыцыі. Прычынай стала неабходнасць вызначэння колькасці земскіх і гарадскіх участкаў. Міністр юстыцыі М. В. Мураўёў адзначыў неякасную працу над праектам па рэалізацыі рэформы з боку мясцовых губернатараў. Гэта было звязана з тым, што па ўстаноўленых правілах усе мясцовыя распараджэнні па падрыхтоўцы рэформы ўскладаліся на губернатара, часовыя губернскія і павятовыя камітэты з удзелам прадстаўнікоў судовага ведамства. Гэты парадак быў парушаны ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, дзе праект рэформы разглядаўся толькі губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі. Па гэтай прычыне, на думку міністра юстыцыі, многія бакі рэформы засталіся недастаткова прапрацаванымі. У якасці прыкладу міністр прывёў пытанне аб колькасці гарадскіх суддзяў і аб межах іх участкаў у Мінскай губерні, якое разглядалася без удзелу саміх суддзяў, а таксама пытанне аб арганізацыі суда і кіравання ў мястэчках са значнай доляй яўрэйскага насельніцтва [3, арк. 76].

Спрэчка ўзнікла вакол павятовых гарадоў Навагрудак, Рэчыца, Мазыр і Ігумен, а таксама гарадоў Нясвіж і Докшыцы. У праектах МУС і губернскай па сялянскіх справах прысутнасці на гэтыя гарады распаўсюджвалася юрысдыкцыя земскіх начальнікаў. Мінскаму губернатару М. М. Трубяцкаму быў накіраваны канфідэнцыйны ліст ад кіраўніка Земскага аддзела МУС Г. Г. Савіча, у якім паведамлялася, што міністр юстыцыі настойваў на неабходнасці ўвядзення ў гэтых гарадах пасады гарадскога суддзі.

Спрэчнае пытанне аб увядзенні ў павятовых гарадах пасады гарадскога суддзі было вынесена на сесію Дзяржаўнага савета ў 1899 г., дзе меркаваўся

разгляд праектаў Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства юстыцый аб распаўсюджванні дзеяння «Палажэння аб земскіх участковых начальніках» на Мінскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні [3, арк. 78–79]. Аднак на гэтым паседжанні з-за рознагалоссяў увядзенне інстытута земскіх начальнікаў у беларускіх губернях апынулася пад пытаннем. Тым не менш, імператар 7 чэрвеня 1899 г. прызнаў неабходным распаўсюджванне на дадзеныя губерні законапалажэнняў ад 12 ліпеня 1889 г. [4, с. 369].

Па загадзе міністра ўнутраных спраў стварaліся губернскія камітэты па прывядзенні ў дзеянне «Палажэння аб земскіх участковых начальніках» [5, арк. 6]. Акрамя таго, былі створаны часовыя павятовыя камітэты на чале з павятовымі правадырамі дваранства. Губернскія камітэты павінны былі прадставіць у МУС справаздачу аб колькасці земскіх участкаў, аб увядзенні ў павятовых гарадах пасады гарадскога суддзі і аб распаўсюджванні юрысдыкцыі земскіх начальнікаў на розныя катэгорыі сельскага насельніцтва. Сітуацыя ўскладнялася тым, што сельскае насельніцтва Беларусі мела стракатую структуру, у якой асобна вылучаліся стараверы і праваслаўныя арандатары. Яны займаліся сельскай гаспадаркай, але прыпісваліся, як правіла, да мяшчанскага саслоўя [6, с. 209]. Задачай павятовых камітэтаў стаў збор максімальна поўных звестак па гарадах і мястэчках.

На пасяджэнні Мінскага часовага губернскага камітэта 10 верасня 1899 г. было прынята рашэнне, што ўсе мястэчкі Мінскай губерні павінны быць уключаны ў склад земскіх участкаў. Прычынай такога рашэння стала нязначная колькасць у іх насельніцтва. На думку часовага губернскага камітэта, толькі мястэчка Разводава Навагрудскага павета магло быць уключана ў склад участка гарадскога суддзі [5, арк. 40].

Дыскусійныя пытанні, звязаныя з правядзеннем у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях рэформы мясцовага кіравання, абмяркоўваліся ў Дзяржаўным савеце. Найбольшыя рознагалоссі выклікала пытанне аб падсуднасці валасному суду яўрэяў, асоб, якія паходзілі з былой шляхты, вечных чыншавікоў, арандатараў праваслаўнага веравызнання, старавераў, аднаверцаў, мяшчан, рамеснікаў і цэхавых. Меркаванні наконт гэтага падзяліліся. Большасць прыйшла да высновы аб захаванні падсуднасці валасному суду розных катэгорый насельніцтва, якія мелі пастаяннае месцажыхарства ў сельскай мясцовасці. Меншасць савета палічыла неабходным выключыць з падсуднасці валаснога суда справы, дзе абодва бакі з'яўляліся прадстаўнікамі яўрэйскага насельніцтва. У сувязі з гэтым яны абапіраліся на рашэнне Віцебскага і Мінскага губернскіх камітэтаў, якія сцвярджалі, што яўрэйскае насельніцтва аказвала «шкодны ўплыў»

на дзейнасць валасных судоў і на ход судовых разбораў [4, с. 381–382]. На паседжанні Дзяржаўнага савета не было прынята надзінага меркавання па дадзеным пытанні.

12 чэрвеня 1900 г. імператарам было прынята «Найвышэйша зацверджанае меркаванне аб распаўсюджванні законапалажэнняў 12 ліпеня 1889 г. аб пераўтварэнні сялянскіх і судовых устаноў на губерні Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую» [7, с. 762–764].

У чэрвені 1901 г. міністр унутраных спраў Дз. С. Сіпягін накіраваў ліст мінскаму губернатару, у якім паведаміў, што МУС сумесна з Міністэрствам юстыцыі і Міністэрствам фінансаў устанавіла ў якасці канчатковага тэрміну ўвядзення ў дзеянне на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў «Палажэння аб земскіх участковых начальніках» 1 кастрычніка 1901 г.

У гэты перыяд быў праведзены шэраг мерапрыемстваў па практычнай рэалізацыі рэформы мясцовага кіравання. У прыватнасці, Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць зацвердзіла падрабязную інструкцыю для павятовых з'ездаў, валасных праўленняў і земскіх начальнікаў наконт іх першапачатковай дзейнасці [5, арк. 239].

Міністр унутраных спраў даручыў губернатарам правесці «ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды ўвядзення новай пасады, каб усім было відаць, якое значэнне надаецца новай рэформе» [5, арк. 355]. У Мінскай губерні 1 кастрычніка 1901 г. прайшла літургія, якую правёў епіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл. Земскія начальнікі, якія не займалі раней судовых пасад, былі ўрачыста прыведзены да прысягі [5, арк. 357].

У кастрычніку 1901 г. пачалі сваю працу павятовыя з'езды. На іх першых пасяджэннях былі разгледжаны пытанні аб назначэнні кандыдатаў у валасныя суддзі, аб выбранні земскіх начальнікаў членамі павятовай па воінскай павіннасці прысутнасці. Найбольш востра стаяла пытанне аб неабходнасці часовай замены земскіх начальнікаў, якія не прыступілі своечасова да сваіх службовых абавязкаў [5, арк. 361–366].

Міністр унутраных спраў у лісце віцебскаму губернатару І. І. Чапялеўскаму напісаў, што пасля ўвядзення інстытута земскіх начальнікаў у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях імператар адзначыў: «дзякую за праяўленыя пачуцці і спадзяюся, што земскія начальнікі і ў беларускіх губернях прынясуць такую ж карысць, якую яны ўжо прынеслі ў іншых мясцовасцях Расіі» [8, арк. 64].

Увядзенню інстытута земскіх начальнікаў у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерніях папярэднічаў доўгі працэс абмеркавання магчымасці распаўсюджвання рэформы мясцовага кіравання на гэтыя тэрыторыі. Падрыхтоўка да яе правядзення атрымала шэраг асаблівасцяў, што, у сваю чаргу, было звязана з больш складанай сацыяльнай і канфесійнай

структурай насельніцтва беларускай вёскі, незавершанасцю і неўпарадкаванасцю працэсу ўрэгулявання пазямельных адносін, рознагалоссямі паміж Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам юстыі па пытаннях падзелу паўнамоцтваў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Материалы о подготовке к приведению в действие Положения 12 июля 1889 г. о введение института земских начальников на территории Минской губернии с 1 октября 1901 г. (1893–1895 гг.) // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 54.

2. Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам за 1893 г. генерал-губернаторов, губернаторов, начальников областей и градоначальников. СПб: Гос. тип., 1895. 115 с.

3. Материалы о подготовке к приведению в действие Положения 12 июля 1889 г. о введении института земских начальников на территории Минской губернии с 1 октября 1901 г. // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 61.

4. Отчет по делопроизводству Государственного совета за сессию 1899–1900 гг. СПб: Тип. Второго Отд-ния Собств. Е. и. вел. канцелярии, 1900. Т. 2. VII.

5. Материалы по подготовке к приведению в действие Положения от 12 июля 1889 с 21 июля 1899 г. по 8 октября 1901 г. // НГАБ. Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 65.

6. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2013.

7. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета о распространении законоположений 12 июля 1889 года о преобразовании крестьянских и судебных учреждений на губернии Витебскую, Минскую и Могилевскую : 12 июня 1900 г., № 18854 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. СПб., 1900, Т. 20. С. 762–764.

8. Дело о выборах волостных судей, о запрещении евреям приобретать от помещиков и крестьян поземельную собственность в западных губерниях // НГАБ. Ф. 2716. Воп. 1. Спр. 2.